## ДЗЕЙНАСЦЬ КАМІСІЙ ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ ГАЛАДАЮЧАМУ НАСЕЛЬНІЦТВУ ПАВОЛЖА Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1922 гг.)


*Г.Х. Базарэвіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Рэпазіторый ВДУ

Для ліквідацыі наступстваў голаду ў 1921–1922 г., які ахапіў буйныя абшары Расіі, патрабаваліся каласальныя сродкі. Спадзяванні ўскладаліся на ўраджайныя губерні і суседнія рэспублікі, насельніцтва якіх не мела такіх нястач, як у галадаючых раёнах. Для арганізацыі працы ў гэтым напрамку ствараліся адмысловыя камісіі па аказанні дапамогі галадаючым. Дадзеныя аб аказанні дапамогі насельніцтву Паволжа дзяржаўнымі і грамадскімі органамі савецкай Беларусі носяць фрагментарны характар, а пытанне аб дзейнасці мясцовых камісій дапамогі галадаючым застаецца ўвогуле нераскрытым у навуковай літаратуры.

Мэта даследавання – вызначыць структуру і функцыі камісій па аказанні дапамогі галадаючаму насельніцтву Паволжа ў савецкай Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Для даследавання былі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, заканадаўчыя акты Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Дзяржаўныя органы Беларускай ССР, тэрыторыя якой на той час складалася з 6 паветаў, хутка прыступілі да працы па выратаванню пацярпелых. Усходнебеларускія землі – Віцебская і Гомельская губерні, што на той час уваходзілі ў склад РСФСР, таксама прынялі на сябе абавязак па аказанні дапамогі. Для арганізацыі гэтай справы пры Цэнтральным выканаўчым камітэце Беларускай ССР была створана Цэнтральная камісія па аказанні дапамогі галадаючым (далей ЦК Памгол Беларусі), а ў Віцебскай і Гомельскай губернях РСФРС – губернскія камісіі па аказанні дапамогі галадаючым.

ЦК Памгол Беларусі прыступіла да працы 30 ліпеня 1921 г., арганізаваўшы свае аддзяленні ў Мінску, Бабруйску, Слуцку, Мозыры, Бырысаве і Ігумене [1, с. 111]. У адпаведнасці з пастановай прэзідыума выканаўчага камітэта Віцебскага губернскага Савета працоўных, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 8 ліпеня 1921 г. была створана Віцебская губернская камісія па аказанні дапамогі галадаючым [2, с. 37 зв.]. Пазней, па распараджэнні Усерасійскага Цэнтральнага выканаўчага камітэту аб арганізацыі на месцах камісіі па арганізацыі працы дапамогі пацярпелым, 26 ліпеня пленум Гомельскага губвыканкама таксама стварыў губкампамгол [3, с. 55].

Гэта былі органы, якія займаліся ўзгадненнем і кантролем дзейнасці мясцовых ведамстваў у пытаннях дапамогі пацярпелым ад бедства. Першаснай задачай было стварэнне камісій ва ўсіх паветах, на фабрыках, заводах, прадпрыемствах і ўстановах, якія б узялі на сябе ролю рэпрадуктара і выканаўцы распараджэнняў у сваёй мясцовасці і працоўных калектывах.

Асноўнай задачай губернскіх камісій былі зборы добраахвотных натуральных і грашовых ахвяраванняў, адлічэнняў падаткаў на дапамогу галадаючым, размеркаванне гэтых сродкаў для аказання дапамогі бежанцам і адпраўка хлеба ў Паволжа. Вышэйшым органам губкампамголаў з'яўляўся пленум, які склікаўся кожны месяц. Паміж пленумамі кіраўніцтва ажыццяўляў прэзідыум, які ўзначальваў старшыня. Прэзідыум праводзіў пасяджэнні 2 разы на тыдзень. Усімі цякучымі пытаннямі займаўся сакратар. Тэхнічнай працай займалася ўпраўленне справамі, пры якім былі створаны камісіі – дзіцячая, інвалідная, рэвізійная і арганізацыйная [4, с. 18]. Падпарадкоўваліся губернскія камісіі непасрэдна Цэнтральнай камісіі па аказанні дапамогі галадаючым на чале са старшынёй Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту М. Калініным [5, с. 466].

У Беларускай ССР камісіі па аказанні дапамогі галадаючым не стваралі асобнага апарата, а фарміравалі яго за кошт адпаведных аддзелаў выканкамаў. Гэта было абумоўлена задачамі,

што стаялі перад уладамі: аднаўленне сельскай гаспадаркі і дапамога насельніцтву ў Паволжы (забеспячэнне інвентаром, жывёлай, прадуктамі харчавання), прыём і ўладкаванне бежанцаў, клопат пра дзяцей, барацьба з беспрацоўем (арганізацыя працоўных артэляў), дапамога інвалідам вайны і працы. Гэтыя пытанні стаялі на парадку дня ў ведамствах сацыяльнага забеспячэння, народнай адукацыі, аховы здароўя, упраўлення па эвакуацыі і інш. Па гэтай прычыне мэтазгодна было фарміраваць камісіі з прадстаўнікоў адпаведных аддзелаў.

Такім чынам, на камісіі па аказанні дапамогі галадаючым ускладаліся наступныя абавязкі:

- арганізацыя збору ахвяраванняў і адлічэнняў для пацярпелых ад бедства;
- каардынацыя працы павятовых камісій па аказанні дапамогі галадаючым (сістэма камісій па аказанні дапамогі пацярпелым складалася ў адпаведнасці з адміністрацыйным падзелам: напачатку кампаніі ў савецкай Беларусі працавалі 6 павятовых і 1 гарадская камісія, у Віцебскай губерні – 11 павятовых і 1 гарадская, у Гомельскай 13 павятовых і 1 гарадская камісіі);
- каардынацыя працы па аказанні дапамогі галадаючым ва ўстановах, арганізацыях, прадпрыемствах [2, с. 38].

У барацьбе з голадам першапачаткова быў зроблены разлік на эфектыўнае супрацоўніцтва насельніцтва і дзяржаўных органаў. Іншымі словамі, гатоўнасць грамадзян ахвяраваць грошы і прадукты была закладам выратавання пацярпелых ад бедства. Аднак, да такой ініцыятывы большасць насельніцтва ставілася індыферэнтна. Гэта было звязана як са складаным эканамічным становішчам (увядзенне сістэмы харчпадатку), так і з адсутнасцю ўсведамлення маштабаў бедства. Відавочнай была неабходнасць інфармаваць грамадзян аб прычынах, распаўсюджанні і наступствах голаду.

Стартам у барацьбе з голадам у Паволжы стала буйная агітацыйная кампанія. Для яе эфектыўнасці пры камісіях ствараліся адмысловыя аддзелы, якія адказвалі за правядзенне агітацыі ў розных формах. На першых этапах, калі ўдзел у кампаніі насіў добраахвотны характар, агітацыя мела ключавую ролю. У розных сваіх праявах яе мэтай стала не толькі стварэнне прыязнай атмасферы сярод грамадства для правядзення збораў, але і стымуляванне ахвяраваць і далучаць сваё атачэнне да гэтай справы.

Камісіі па аказанні дапамогі галадаючым выконвалі функцыі па каардынацыі і арганізацыі буйной кампаніі “Тыдзень дапамогі галадаючым”. Сутнасцю яе правядзення было прыцягненне ўсіх савецкіх і прафесійных органаў, шырокіх мас працоўных і сялянства да аказання дапамогі пацярпелым ад голаду ў Паволжы [6, с. 752].

За працу па арганізацыі працы ў дробных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках адказвалі павятовыя і валасныя камісіі па аказанні дапамогі галадаючым. Уключэнне сялянства ў кампанію было важнай задачай, таму што вёска на той час была асноўнай крыніцай насення для азімага кліну ў Паволжы, абнасеньванне якога было закладам новага ўраджаю. Па ініцыятыве валасных камісій у вёсках праходзілі дні збору на карысць Паволжа [7, с. 2].

Пасля замацавання Саратаўскай губерні за Беларускай ССР, а яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Аўтаномнай вобласці Немцаў Паволжа за Віцебскай і Гомельскай губерняй РСФСР, у склад камісій па аказанні дапамогі галадаючым увайшлі прадстаўнікі з галадаючых тэрыторый.

**Заключэнне**. Папярэднія вынікі працы камісій былі станоўчыя і праца прызнавалася эфектыўнай. Але ў канцы 1921 г. стала відавочна, што добраахвотныя ахвяраванні не прыносяць неабходную колькасць матэрыяльных рэсурсаў. Наспяванне незадаволенасці сярод насельніцтва таксама прывяло да спаду актыўнасці ўдзелу ў кампаніі дапамогі галадаючым. Таму асноўныя напрамкі працы па стымуляванню насельніцтва да спачування трансфармаваліся ў каардынацыю працы па спагнанню абавязковых адлічэнняў і падаткаў.

Спіс літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф.6. – Воп.1. – Спр.97.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). – Ф.570. – Воп.1. –Спр. 36.
3. Отчёт Гомельского губернского исполнительного комитета, декабрь 1921 г. – ноябрь 1922 г. – Гомель: [б.и.], 1922. – 417 с.
4. ДАВВ. – Ф. 570. – Воп. 1. – Спр. 33.
5. ДАВВ. – Ф. 570. – Воп. 1. – Спр. 58.
6. Собрание узаконений и распоряжений Правительства за 1921 г. [Электронный ресурс]. – М.: Управ. Дел. Совнарк. СССР, 1944. – 1207 с. – Режим доступа: http://www.znanium.com/. 26.09.2016 г.
7. Беларусь на дапамогу галадаючым [аб арганізацыі працы па зборы сродкаў на карысць галадаючых у валасцях] // Савецкая Беларусь (выданне Усебеларускага выканаўчага камітэту Саветаў). – 1921 г. – 28 кастрычніка.

Репозиторий ВГУ